УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
**“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА”**

УДК 808.26 – 331

**СЕМЯНЬКОВА ГАЛІНА КАНСТАНЦІНАЎНА**

# ПРОЗВІШЧЫ ЖЫХАРОЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СТРУКТУРА, СЕМАНТЫКА, ГЕАГРАФІЯ

10. 02. 01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Мінск -- 2002

Работа выканана на кафедры беларускай мовы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава

Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук прафесар Мезенка Г. М. (ВДУ імя П. М. Машэрава, кафедра рускага і агульнага мовазнаўства)

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук прафесар Лемцюгова В. П. (Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі, загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі)

кандыдат філалагічных навук Гурская Ю. А. (БДПУ імя Максіма Танка, кафедра тэорыі і гісторыі мовы)

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца 01 сакавіка 2002 г. у $16^{\underline{00}}$ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02. 21. 01 у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка (220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482, тэл. 268-79-27)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Аўтарэферат разасланы “ ” студзеня 2002 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый П. А. Міхайлаў

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Пры ўсім багацці і разнастайнасці прац па беларускай антрапаніміі застаецца малавывучаным або не даследаваным увогуле матэрыял асобных рэгіёнаў Беларусі, у прыватнасці сучасныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, якія не толькі з'яўляюцца неад'емнай часткай лексічнай сістэмы мовы, але і ўтвараюць у ёй унікальную падсістэму з толькі ёй уласцівымі спецыфічнымі сродкамі, заканамернасцямі змянення, функцыянавання і распаўсюджання. Акрамя сваёй асноўнай функцыі -- ідэнтыфікацыі асобы, вылучэння яе з пэўнага асяроддзя, прозвішчы ўтрымліваюць "зашыфраваную" інфармацыю пра асаблівасці рассялення, шляхі гістарычнага развіцця народа, яго ўзаемаадносіны з іншымі этнасамі, адметнасць яго культуры – традыцый, звычаяў, веравызнання. У антрапонімах адлюстроўваюцца моўныя асаблівасці ўтварэння, змянення і ўжывання слоў.

Такім чынам, актуальнасць нашага даследавання прадыктавана неабходнасцю ўсебаковага апісання прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны як часткі анімічнай прасторы беларусаў, што дазволіць вызначыць адметнасць антрапанімных адзінак, асаблівасці і традыцыі называння на паўночнай тэрыторыі Беларусі, выявіць фактары, якія аказвалі ўплыў на характар прозвішчаў.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Тэма дысертацыі з'яўляецца састаўной часткай Дзяржаўнай праграмы "Даследаванне беларускай мовы на рубяжы тысячагоддзяў, яе гісторыі, сучаснага стану, сувязі з іншымі славянскімі мовамі" (2001 – 2005 гг.), зафіксаванай у каардынацыйным цэнтры НАН РБ. Праца выканана ў адпаведнасці з праграмай на 2001 – 2003 гг. Выбар тэмы і рэгіёна даследавання абумоўлены комплекснай навукова-даследчай праграмай "Лінгвакультуралагічныя асаблівасці Беларускага Паазер'я" (рэг. № 20011472 ад 17. 05. 2001 г.), над ажыццяўленнем якой з 2001 г. працуе калектыў вучоных Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава.

**Мэта і задачы даследавання. Мэта** даследавання -- комплексны аналіз сучасных прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ў структурным, семантычным і лінгвагеаграфічным аспектах. Пастаўленая мэта патрабавала вырашэння наступных **задач:**

1) сабраць сучасныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны;
2) раскласіфікаваць антрапонімы па структуры, вызначыць прадуктыўнасць розных прозвішчных тыпаў;
3) ажыццявіць апісанне прозвішчаўтваральных асноў у тэрмінах семантычнага поля, устанавіць адметнасць ядзерна-перыферыйных адносін паміж элементамі;

4) вызначыць асаблівасці размяшчэння розных па семантыцы прозвішчаўтваральных асноў і па структуры антрапанімных адзінак на тэрыторыі Віцебскай вобласці, выявіць фактары, якія аказваюць уплыў на характар іх распаўсюджання;
5) супаставіць вынікі нашага назірання і аналізу з данымі, атрыманымі іншымі даследчыкамі, выявіць спецыфічнасць прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ў семантычным, структурным і лінгвагеаграфічным планах.

**Аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ектам** даследавання ў дысертацыі з'яўляюцца сучасныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны. **Прадмет** разгляду – структура, семантыка і геаграфія прозвішчаў жыхароў даследуемай тэрыторыі. У якасці асноўных крыніц пры зборы матэрыялу былі выкарыстаны пагаспадарчыя кнігі асноўных вытворчых паказчыкаў гаспадарак калгаснікаў за пасляваенны перыяд (40-я гг. XX ст.), якія захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і яго занальных архіваў у Полацку, Глыбокім і Оршы. Дадатковымі крыніцамі з'яўляюцца тэлефонныя даведнікі абанентаў раённых вузлоў сувязі; вынікі апытання жыхароў, праведзенага аўтарам падчас экспедыцый; матэрыялы завочнага конкурсу "Сучасная антрапанімія Віцебшчыны", які праводзіўся Віцебскім абласным аб'яднаннем па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі сумесна з Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. М. Машэрава (кастрычнік 2000 г. – красавік 2001 г.).

Агульная колькасць сабраных прозвішчаў – каля 8,5 тысяч адзінак.

**Гіпотэза.** Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, з'яўляючыся неад'емнай часткай як агульнабеларускага, так і агульнаславянскага антрапанімікону і захоўваючы ўласцівыя гэтым сістэмам традыцыі, валодаюць адметнымі ў структурным, семантычным і геаграфічным планах рысамі.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Асноўны метадалагічны прыём абумоўлены характарам даследаванага матэрыялу і заключаецца ў наступным: сінхронны падыход да вывучэння прозвішчаў спалучаецца з дыяхронным. Такое аб'яднанне з'яўляецца неабходным, паколькі апісанне антрапанімнага матэрыялу немагчыма без уліку гістарычных працэсаў, фактаў, падзей і інш.

Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны розныя метады і прыёмы аналізу. На пачатку працы была праведзена інвентарызацыя антрапанімнага матэрыялу, а таксама класіфікацыя яго на аснове структурнага, семантычнага і лінгвагеаграфічнага аналізу. Падчас далейшага даследавання аўтарам выкарыстоўваліся апісальны, параўнальна-супастаўляльны, параўнальна-гістарычны, арэальны метады, элементы статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Навуковая навізна работы заключаецца ў наступным:

-- уведзены ў сферу навуковага аналізу новы, нікім да гэтага не даследаваны матэрыял;

-- выяўлена адметнасць прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ў структурным плане;

-- упершыню ў беларускім мовазнаўстве семантычныя асаблівасці прозвішчаўтваральных асноў апісаны ў тэрмінах семантычнага поля;

-- вызначаны, апісаны і праілюстраваны на картах ступень прадуктыўнасці прозвішчаў усіх структурных тыпаў, а таксама распаўсюджанне антрапонімаў, утвораных ад семантычна розных апелятываў;

-- прааналізаваны ўплыў сацыялінгвістычных, нацыянальна-рэлігійных, грамадска-палітычных і іншых фактараў на характар найменняў і на частотнасць асобных тыпаў прозвішчаў у розных рэгіёнах вобласці.

Такім чынам, навуковая навізна вынікаў дысертацыйнага даследавання прадыктавана далейшым развіццём рэгіянальнай антрапанімікі як галіны анамастыкі, выяўленнем спецыфікі прозвішчаў жыхароў паўночнай Беларусі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Выкарыстаныя ў дысертацыі метады і прыёмы аналізу могуць быць прыменены пры даследаванні антрапанімных адзінак іншых тэрыторый.

Сучасны антрапанімікон Віцебшчыны, фарміраванне якога адбывалася на працягу некалькіх стагоддзяў, адлюстроўвае шматлікія гістарычныя і сацыяльныя працэсы, моўныя і культурныя асаблівасці, таму з'яўляецца каштоўным матэрыялам для гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, дыялектолагаў, моваведаў і інш.

Дысертацыя акажа рэальную дапамогу работнікам ЗАГСаў і пашпартных сталоў пры вырашэнні пытанняў, звязаных з захаваннем аднастайнасці ў напісанні прозвішчаў, з перадачай іх сродкамі іншай мовы.

Матэрыял і вынікі даследавання могуць быць прыменены ў практыцы школьнага і універсітэцкага выкладання -- на лекцыях і практычных занятках па сучаснай беларускай мове (пры вывучэнні лексікі, словаўтварэння і інш.), стылістыцы, лінгвістычным аналізе тэксту, на спецкурсах і спецсемінарах, пры падрыхтоўцы і напісанні курсавых і дыпломных работ; на ўроках, факультатывах, занятках гурткоў па беларускай мове, гісторыі, пры ажыццяўленні краязнаўчай працы, правядзенні конкурсаў, алімпіяд і да т. п.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Дэрывацыя пры ўтварэнні прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны была больш характэрна, чым трансанімізацыя. Дэрываты прадстаўлены адзінаццаццю прозвішчнымі тыпамі -- шасцю агульнаславянскімі, двума усходнеславянскімі і трыма ўнутрымоўнымі, у тым ліку двума беларускімі і адным рускім. Кожны тып вылучаецца характэрнай для яго частотнасцю адзінак не толькі ў межах вобласці, але і на меншых па плошчы тэрыторыях.

2. У якасці асноўнай зыходнай базы пры ўтварэнні прозвішчаў жыхароў даследаванай тэрыторыі выступалі мянушкі і нецаркоўныя імёны апелятыўнага паходжання. Радзей прозвішчаўтваральную функцыю выконвалі розныя формы адаптаваных мужчынскіх кананічных імёнаў праваслаўнага і каталіцкага календара, а таксама найменні тапанімнага характару. Надзвычай рэдка ў гэтай ролі выступалі неадаптаваныя хрэсныя і старажытнаславянскія мужчынскія імёны, жаночыя імёны і мянушкі, імёны запазычаныя – яўрэйскія, арабскія, літоўскія.

3. Прозвішчы неаднолькава размешчаны на тэрыторыі Віцебшчыны. У межах кожнага структурнага тыпу вылучаецца ад аднаго да трох масіваў самай высокай прадуктыўнасці, па меры аддалення ад якіх частотнасць прозвішчаў паступова памяншаецца. Сярод антрапонімаў, матываваных "колеравымі" апелятывамі, арэалы высокай і нізкай канцэнтрацыі ўтвараюць толькі прозвішчы з элементам *бел-*. Адзінкі ж, якія паходзяць ад апелятываў, што абазначаюць іншы колер, амаль раўнамерна распаўсюджаны на тэрыторыі паўночнай Беларусі. Не заўсёды зона бытавання прозвішчаў, у аснове якіх пэўныя варыянты назвы прафесіі або роду занятку, супадае з тэрыторыяй, на якой гэтыя апелятывы сёння ўжываюцца.

4. Як характар прозвішчаўтваральнай асновы, так і тып фарманта залежаць ад розных лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў: антрапанімных, дыялектных, культурных традыцый, якіх прытрымліваюцца на пэўнай тэрыторыі; нацыянальна-рэлігійнай прыналежнасці насельніцтва; блізкасці тэрыторый, агульнасці гістарычнага развіцця жыхароў даследаванай тэрыторыі і народаў суседніх дзяржаў.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым даследаваннем. Матэрыялы напісаны без удзелу сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя прайшла абмеркаванне на пасяджэннях кафедры беларускай мовы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава (лістапад 2000 г.; лістапад 2001 г.). На тэме даследавання былі зроблены даклады і паведамленні на васьмі навуковых, у тым ліку дзвюх міжнародных і дзвюх рэспубліканскіх канферэнцыях: IV (51), V (52), VI (53) канферэнцыях выкладчыкаў,

навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава (Віцебск, люты 1999 г., люты 2000 г., люты 2001 г.); V (50) навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў (Віцебск, красавік 2001 г.); V і VI Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Рэспублікі Беларусь (Гродна, красавік 2000 г.; Віцебск, кастрычнік 2001 г.); V Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія" (Віцебск, май 2000 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Праблемы гісторыі і культуры Верхняга Падняпроўя" (Магілёў, кастрычнік 2001 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання выкладзены ў дзесяці апублікаваных аўтарам работах агульным аб'ёмам 68 друкаваных старонак, у тым ліку ў чатырох артыкулах у рэцэнзаваных выданнях, трох матэрыялах навуковых канферэнцый, двух тэзісах дакладаў на канферэнцыях, адным метадычным дапаможніку.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спісу выкарыстанай літаратуры, які змяшчае 207 назваў. Агульны аб'ём даследавання – 149 старонак, з якіх асноўны тэкст займае 106 старонак. У дысертацыі прыведзена таксама 3 дыяграмы, 5 табліц, 22 карты.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ

Ва **уводзінах** пададзены кароткія звесткі пра гісторыю ўзнікнення прозвішчаў, а таксама пра стан вывучанасці беларускай антрапаніміі.

У **першай главе** "Структура прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны" антрапонімы разглядаюцца ў структурным аспекце: асобна аналізуюцца першасныя (ім належыць амаль 30% у антрапаніміконе жыхароў Віцебшчыны) і другасныя прозвішчы (больш за 70%). Дэрывацыя, якая заключалася ў далучэнні прозвішчаўтваральных фармантаў да прозвішчаўтваральных асноў, як відаць з падлікаў, была больш характэрна на даследуемай тэрыторыі, чым трансанімізацыя.

Першасныя антрапонімы (раздзел 1) найчасцей супадаюць з апелятывамі-назоўнікамі: ім належыць амаль 80% ад агульнай колькасці першасных прозвішчаў, значна радзей – з асабовымі мужчынскімі імёнамі – 15,74% і апелятывамі-прыметнікамі – 4,64%. Невялікую групу складаюць запазычныя і "цьмяныя", "непразрыстыя" прозвішчы.

Адносна прозвішчаў, якія ўяўляюць сабой трансанімізаваныя яўрэйскія і літоўскія імёны, можна дапусціць, што яны былі ўтвораны не ў мове-крыніцы. Адзінкі ж з неўласцівымі для беларускай антрапанімнай

сістэмы фармантамі *-сон, -ман, -берг, -бург* хутчэй за ўсё ўтварыліся па-за межамі даследуемай тэрыторыі і былі перанесены на Віцебшчыну ў выніку перасялення іх носьбітаў.

Другасныя прозвішчы (раздзел 2) размеркаваны па агульнаславянскіх, агульнаўсходнеславянскіх і ўнутрымоўных тыпах. У дысертацыі ажыццяўляецца аналіз усіх прозвішчных тыпаў, якія бытуюць на Віцебшчыне: прадуктыўнасць на даследуемай тэрыторыі, месца ў агульнай сістэме другасных адзінак, характар прозвішчаўтваральных асноў і інш.

На тэрыторыі Віцебшчыны выкарыстоўваецца адзінаццаць прозвішчных тыпаў: шэсць агульнаславянскіх, два ўсходнеславянскія, тры ўнутрымоўныя – два беларускія і адзін рускі.

Першае месца па прадуктыўнасці займае агульнаславянскі прозвішчны тып на *-оў/-еў/-аў, -ін/-ын* (35,3%), на долю якога прыходзіцца больш за трэцюю частку ўсіх прозвішчаў. Частотнасцю вылучаюцца агульнаславянскія тыпы на *-скі/-цкі* і на *-овіч/-евіч/-авіч*: ім належыць адпаведна 11,55% і 8,8%, а таксама ўсходнеславянскі тып на *-енка/-энка/-анка* (7,08%). Такім чынам, першая чацвёрка найбольш распаўсюджаных на Віцебшчыне прозвішчных тыпаў не адрозніваецца па складу ад агульнага паказчыка па Беларусі.

Прадуктыўнасць унутрымоўнага беларускага тыпу на *-ёнак/-онак* на Віцебшчыне амаль у чатыры разы перавышае агульнабеларускі паказчык (4,5%). На даследаванай тэрыторыі гэтаму тыпу належыць пятае месца, увогуле ж у рэспубліцы – сёмае. Астатнія прозвішчныя тыпы з'яўляюцца малапрадуктыўнымі: іх частотнасць блізкая да 1%. Зафіксавана каля дзесятка антрапонімаў на *-іх/-ых*, утвораных на ўзор унутрымоўнага тыпу, характэрнага рускай мове і не адзначанага дагэтуль даследчыкамі антрапаніміі іншых тэрыторый Беларусі.

Асноўная большасць прозвішчаўтваральных фармантаў носіць патранімічны або матранімічны характар. Вылучаюцца антрапонімы з фармантамі, якія першапачаткова належылі дэмінутыўным (*Каросцік, Коўшык, Русачонак, Федасеня*) або атрыбутыўным (*Баговец, Латыгалец*) формам, а патранімічнае значэнне набылі толькі падчас прозвішчаўтварэння.

У якасці прозвішчаўтваральнай асновы, як правіла, выступалі мянушкі апелятыўнага паходжання і хрэсныя мужчынскія імёны, прычым першыя – намнога часцей, чым другія. Рэдка прозвішчаўтваральны фармант далучаўся да старажытнаславянскіх мужчынскіх і жаночых імёнаў, мянушак і хрэсных імёнаў жанчын, а таксама яўрэйскіх, арабскіх, мангольскіх імёнаў.

Прозвішчаўтваральныя асновы другасных прозвішчаў ідэнтычныя асновам першасных: вядучае месца належыць назоўнікам апелятыўнага

паходжання, значнае месца – уласным асабовым мужчынскім імёнам, нязначнае -- апелятывам-прыметнікам. Невялікую групу складаюць антрапонімы, у якіх фармант далучаны да андронімаў – найменняў жанчыны па мужу, якія і зараз выкарыстоўваюцца на даследаванай тэрыторыі: *Афіцэркін, Васілішын, Салдаткін.* Нярэдка прозвішчаўтваральныя асновы ўяўляюць сабой суфіксальныя дэрываты: *Петруш-энка, Слышанк-оў.* Заўважана, што і ў першасных, і ў другасных прозвішчах набор самых частотных суфіксаў, якімі аформлены прозвішчаўтваральныя асновы, прыкладна супадае.

Звычайна спалучальнасць прозвішчаўтваральных фармантаў і прозвішчаўтваральнай асновы не залежыць ад характару апошняй: практычна ў кожным тыпе назіраюцца самыя розныя базавыя назвы – асабовыя імёны, мянушкі ў форме назоўніка або прыметніка. Аднак валентнасць асобных фармантаў вызначаецца характарам асновы. Так, фармант *-іч* спалучаецца, як правіла, з невытворнымі асновамі апелятыўных назоўнікаў мужчынскага роду, *-скі/-цкі* і *-ец/-эц* – з вытворнымі асновамі тапонімаў, *-еня/-эня* – з асновамі мянушак апелятыўнага паходжання, *-ак/-як* – з мужчынскімі хрэснымі імёнамі.

У **другой главе** "Семантычныя асаблівасці прозвішчаўтваральных асноў" зафіксаваныя антрапонімы аналізуюцца ў тэрмінах семантычнага поля. Такі функцыянальна-стылістычны падыход уяўляецца найбольш мэтазгодным, паколькі дазваляе прадставіць увесь спектр сабраных адзінак у выглядзе паслядоўнай залежнасці іерархічна рознаўзроўневых элементаў – ядра, каляядзернай прасторы і перыферыі.

У ядро ўключаны адапелятыўныя прозвішчы: гэта самыя простыя ў семантычым плане адзінкі, бо зыходная база (апелятыў) у іх вычляняецца вельмі лёгка: *Зязюлькін* (зязюлька). Каляядзерную прастору ўтвараюць больш складаныя па семантыцы антрапонімы -- адыменныя прозвішчы, паколькі яны не валодаюць такой празрыстай унутранай формай, як, напрыклад, адапелятыўныя. Для большасці носьбітаў мовы імёны, што вычляняюцца з адыменных прозвішчаў, не асацыіруюцца з тымі значэннямі, якія заключаны ў гэтых імёнах: *Андрэйчанка* < *Андрэй 'мужны'.* На перыферыю аднесены адтапанімныя прозвішчы: у семантычным плане гэта яшчэ больш складаныя, чым папярэднія, адзінкі, паколькі яны з'яўляюцца другаснымі найменнямі і бяруць пачатак ад сумежнага семантычнага поля – поля тапонімаў: *Браслаўскі* < Браслаў.

Першы раздзел прысвечаны аналізу ядра семантычнага поля, якое з'яўляецца самым багатым па насычанасці кампанентамі: яно змяшчае 40% ад усіх зафіксаваных антрапонімаў. Ядро складаецца з двух мікраядзер: у першае мікраядро ўваходзяць прозвішчы, утвораныя ад nomina personalia -- апелятываў, якія ўжо падчас узнікнення абазначалі асобу (*Баярынаў, Сляпуха, Унуковіч*); другое мікраядро змяшчае

антрапонімы, утвораныя ад nomina impersonalia – апелятываў, якія першапачаткова называлі прадметы, рэчывы, адзінкі флоры, фауны і інш., а магчымасць характарызаваць чалавека атрымалі пасля таго, як набылі пераноснае значэнне і анімізаваліся (*Крацёнак, Мароз, Піражкоў*).

Першае мікраядро ўтрымлівае шэсць сектараў: антрапонімы, утвораныя ад апелятываў, якія а) характарызуюць чалавека ў фізічным і псіхічным плане; б) указваюць на заняткі, прафесію, сацыяльны стан; в) называюць асоб па этнічнай і нацыянальнай прыналежнасці; г) адлюстроўваюць сямейны стан, адносіны або з'яўляюцца тэрмінамі сваяцтва; д) характарызуюць абставіны з'яўлення дзіцяці ў сям'і і адносіны да яго бацькоў; е) апісваюць асаблівасці з'яўлення чалавека ў населеным пункце.

Самым шматкампанентным у названым мікраядры з'яўляецца сектар "Антрапонімы, утвораныя ад апелятываў, якія характарызуюць чалавека ў фізічным і псіхічным плане": ён налічвае больш за тысячу прозвішчаў. Пры гэтым адзінкі, утвораныя ад імёнаў-мянушак, якія адлюстроўвалі **знешнія** прыкметы, значна пераважаюць над антрапонімамі, матываванымі імёнамі-мянушкамі, што ўтрымлівалі ўнутраную характарыстыку (прапорцыя складае прыкладна 3:1). Гэта натуральна, бо менавіта знешнія, а не ўнутраныя якасці з'яўляюцца найбольш паказальнымі пры апісанні асобы. Выяўлена таксама, што апелятывы, якія называюць адмоўныя рысы характару, выкарыстоўваліся пры ўтварэнні прозвішчаў у два разы часцей, чым тыя, што абазначаюць станоўчыя якасці.

Аналіз прозвішчаў, якія паходзяць ад найменняў асоб па этнічнай і нацыянальнай прыналежнасці, выявіў вядучую ролю антрапонімаў, утвораных ад назваў прадстаўнікоў суседніх тэрыторый, і поўную адсутнасць адзінак, што адлюстроўваюць этнас карэннага насельніцтва -- беларусаў. Самыя вялікія гнёзды прозвішчаў утвараюць апелятывы, якія называюць *палякаў* (12 антрапонімаў), *літоўцаў* (11 дэрыватаў) і *немцаў* (10 адзінак). Зафіксавана няшмат дэрыватаў ад этнонімаў *рускі, маскаль* (6 антрапонімаў) і яшчэ менш – ад *татарын, турак, хахол, цыган, чаркес* і інш. Відаць, колькасць утварэнняў ад назваў асоб па этнічнай і нацыянальннай прыналежнасці знаходзіцца ў прамой залежнасці ад гістарычных умоў, у першую чаргу ступені агульнасці развіцця народаў.

Мікраядро, у якое ўключаны прозвішчы, утвораныя ад nomina impersonalia, утрымлівае крыху менш за палову ад усіх адапелятыўных дэрыватаў. У яго складзе знаходзяцца наступныя дзесяць сектараў: антрапонімы, утвораныя ад апелятываў, якія а) называюць прадметы; б) адносяцца да фауны; в) з'яўляюцца адзінкамі флоры; г) фіксуюць анатамічныя назвы; д) абазначаюць абстрактныя паняцці; е) называюць харч; ж) адносяцца да рэлігійных тэрмінаў, атрыбутаў, свят;

з) адлюстроўваюць з'явы прыроды і часавыя паняцці; і) называюць рэчывы; к) абазначаюць грашовыя адзінкі і адзінкі вымярэння.

Шматкампанентнасць сектара "Антрапонімы, утвораныя ад апелятываў, якія называюць прадметы" тлумачыцца, відаць, наступным: імёны-мянушкі паходзілі ад назваў прадметаў і рэчаў, якія акружалі людзей у паўсядзённым жыцці. Напрыклад, вельмі жвавага чалавека маглі празваць *Вераценькам*, сквапнага – *Сундуком*, сухарлявага – *Шылам* або *Шчэпкай*.

Прозвішчы, утвораныя ад апелятываў фауністычнага і фларыстычнага характару, утрымліваюць, як правіла, відавыя і надзвычай рэдка родавыя назвы: антрапонімы, асновы якіх ілюструюць відавыя назвы, выконвалі больш выразную вылучальную ролю і валодалі больш шырокімі асацыятыўнымі магчымасцямі, чым адзінкі, матываваныя родавымі апелятывамі.

Значная частка кампанентаў сектара "Антрапонімы, утвораныя ад апелятываў, якія адносяцца да рэлігійных тэрмінаў, атрыбутаў, свят" матывавана адзінкамі, звязанымі як з хрысціянствам: *Ангельцаў; Багамол; Баговіч; Бесаў; Гаспадзёнак; Духовіч; Пяклёнак; Раеў; Рызо*; *Старавераў; Хрышчановіч; Чарткоў*, так і з язычніцтвам: *Лясун, Ляшак, Шчураў*. Гэта дае падставы меркаваць, што жыхары Віцебшчыны не пазбавіліся яшчэ язычніцкіх традыцый падчас утварэння прозвішчаў.

Такім чынам, апелятыўная лексіка агульнаіндаеўрапейскага, агульнаславянскага і ўласна беларускага паходжання, адлюстраваная ў прозвішчах жыхароў Віцебшчыны, з'яўляецца, як правіла, агульнанацыянальнай. Яна ўключае ўстарэлыя, запазычаныя на даантрапанімным узроўні, а таксама аказіянальныя словы. Устарэлая лексіка фіксуецца ў прозвішчах, утвораных ад апелятываў, якія ўказваюць на прафесію, сацыяльны стан, ад назваў грашовых адзінак і адзінак вымярэння. Сярод запазычанняў дамінуюць словы з польскай, літоўскай, рускай моў, што тлумачыцца адпаведнымі гістарычнымі падзеямі мінулага. Амаль ва ўсіх лексіка-семантычных разрадах прадстаўлены дыялектныя словы – у асноўным беларускія, радзей – рускія, украінскія, польскія.

Аналіз прозвішчных асноў з пункту гледжання антрапанімнай намінацыі паказаў, што на даследуемай тэрыторыі ў якасці антрапанімных асноў выкарыстоўваліся тыя разрады лексікі, якія выконваюць аналагічную функцыю ў іншых славянскіх сістэмах іменавання. Адносна канкрэтных лексем, адлюстраваных у прозвішчах жыхароў Віцебшчыны, трэба заўважыць, што адны з іх адпавядаюць па значэнні адзінкам іншых антрапанімных сістэм, другія ж носяць вузкалакальны характар. Прычына гэтага ў наступным: першыя ўвайшлі ў антрапанімію як уласныя імёны вельмі даўно, а другія -- зусім нядаўна.

У другім раздзеле аналізуецца каляндзерная прастора, якая змяшчае 32% ад усіх антрапонімаў. Яе кампаненты ўтрымліваюць разнастайныя па характары адзінкі: традыцыйна-царкоўныя, адаптаваныя на усходнеславянскай глебе поўныя, размоўна-бытавыя імёны, эмацыянальна-ацэначныя формы і інш. Антрапонімы, у аснове якіх царкоўныя формы хрэсных імёнаў, адзінкавыя на тэрыторыі даследаванага рэгіёна: большасць прозвішчаў паходзіць ад асвоеных на усходнеславянскай і беларускай глебе поўных размоўна-бытавых форм і варыянтаў хрэсных імёнаў.

Паколькі на Беларусі суіснавалі дзве кананічныя іменаслоўныя сістэмы – праваслаўная (або візантыйска-грэчаская) і рымска-каталіцкая, -- то нярэдка варыянты аднаго імені, якое мае рознае гукавое афармленне ў праваслаўным і каталіцкім календарах, служаць базай для ўтварэння адпаведных шматкампанентных прозвішчных радоў: ад праваслаўнага Василий і яго форм паходзяць антрапонімы *Васіленка, Васількоў, Васілёнак, Васькін, Васюцёнак* і інш. (усяго 25 прозвішчаў), ад каталіцкага ж адпаведніка Bazyli – *Базылёў, Базыленка.*

Частка прозвішчаў утрымлівае адзінкі, якія могуць быць кваліфікаваны і як імёны, і як апелятывы: *Забела* < ад літ. Zabele або ад *забела* ‘малако, смятана’; *Уланаў* < ад манг. Улан або ад *улан* ‘кавалерыст’.

Вылучаецца група антрапонімаў, што паходзяць ад старажытных славянскіх імёнаў, якія бытавалі яшчэ да прыняцця хрысціянства: *Багаслоў, Багушэвіч, Бронькін, Ваславёнак, Владысенка, Гарыслаўка* і інш. Найбольшую колькасць прозвішчаў утварылі імёны *Станислав, Владимир, Войтех* і *Богдан.*

На даследуемай тэрыторыі распаўсюджаны прозвішчы, матываваныя імёнамі, якія ўжываюцца літоўцамі (*Анастасіс, Гетаўт, Нарбут*), прадстаўнікамі мусульманскага веравызнання (*Абдулаеў, Габдрахманаў, Шахметаў*), а таксама антрапонімы яўрэйскага або нямецкага паходжання (*Гецман, Давідсон, Якабсон*).

У канцы раздзела прыведзены спіс хрэсных імёнаў, якія на тэрыторыі Віцебшчыны далі найбольшую колькасць прозвішчаў.

Трэці раздзел прысвечаны аналізу адтапанімных прозвішчаў, якім належыць 14% ад усіх зафіксаваных антрапонімаў. Такія адзінкі змяшчаюць у сваіх асновах назвы аб’ектаў, размешчаных на тэрыторыі Віцебскай (ад іх утворана большасць прозвішчаў, што дазваляе выказаць меркаванне аб статусе карэннага ў большасці насельніцтва) і іншых абласцей Беларусі і блізкага замежжа – Расіі, Украіны, Польшчы. Прычым тапонімы, якія абазначаюць населеныя пункты Беларусі і замежжа, адрозніваюцца паміж сабой: першыя называюць дробныя аб’екты (вёска, сяло, хутар, пасёлак, раз’езд, зрэдку -- горад), а другія – вялікія (рака,

горад, раён, вобласць). Тлумачэнне такой з'явы можа быць наступным: хутчэй за ўсё першыя носьбіты прозвішчаў *Донскі, Запарожскі, Крымскі* і падобных – людзі немясцовыя, таму для вылучэння іх з ліку ўраджэнцаў Віцебшчыны было дастаткова агульнай характарыстыкі ('з Запарожжа'; 'з Крыма'; 'з-над Дона'). Для мясцовых жыхароў характарыстыка, напрыклад, 'з-над Віцебска' ці 'з-за Дзвіны' з'ўляецца недастатковай для дакладнай ідэнтыфікацыі асобы, таму ў адносінах да карэнных жыхароў прымянялася больш дэталёвае апісанне: з якой канкрэтна вёскі (сяла, хутара і да т. п.) Віцебшчыны паходзіць чалавек. Прозвішча ж *Віцебскі* або *Дзвінскі* тады вылучае яго носьбіта, калі той знаходзіцца на значнай адлегласці ад аб'екта, назва якога накладзена ў аснову антрапоніма. Дарэчы, на даследуемай тэрыторыі не зафіксаваны прозвішчы *Віцебскі, Дзвінскі*.

**Глава трэцяя** "Лінгвагеаграфічны аспект даследавання прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны" прысвечана лінгвагеаграфічнаму апісанню антрапонімаў, якое ўключае стварэнне карт і каментарыі да іх. У першым раздзеле даследуецца геаграфія ўсіх другасных прозвішчаў, у другім – першасных, а ў трэцім – адзінак, утвораных ад розных у семантычным плане апелятываў.

Розныя паводле ўтварэння прозвішчы жыхароў Віцебшчыны істотна адрозніваюцца ў лінгвагеаграфічным плане. Частотнасць антрапонімаў на захадзе і ўсходзе, на поўдні і поўначы, як правіла, не супадае і можа вар'іравацца ад самага нізкага да найбольш высокага паказчыка.

У межах кожнага прозвішчнага тыпу вылучаецца некалькі рэгіёнаў, якія адрозніваюцца характарам прадуктыўнасці адзінак. Як правіла, кожны прозвішчны тып мае свой адметны масіў самай высокай частотнасці аналізуемых антрапонімаў. Нярэдка такіх масіваў бывае два і нават тры. Вакол зон найбольшай прадуктыўнасці размяшчаюцца тэрыторыі з меншай удзельнай вагой адзначаных прозвішчаў. Масівы маюць розную плошчу – ад плошчы раёна (зрэдку – сельсавета) да плошчы некалькіх раёнаў і нават да 1/3 часткі вобласці.

Прадуктыўнасць антрапонімаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* на ўсходзе вобласці (адпаведна больш за 60% і ад 10% да 15%) набліжаецца да паказчыка сярэдняй частотнасці на рускіх землях (на *-ов/-ев* – 50,36%, на *-ин* – 25,49%). Такая высокая ўдзельная вага прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* ва ўсходняй частцы Віцебшчыны невыпадковая: гэта тэрыторыя з'ўляецца працягам арэала максімальнай прадуктыўнасці аналагічных адзінак у Беларусі, які таксама ахоплівае ўсю Магілёўскую і паўночны ўсход Гомельскай абласцей.

Праведзеныя падлікі даюць падставу сцвярджаць, што ў названы арэал уваходзіць не толькі паўднёвы ўсход Віцебшчыны, як лічылася раней, але і яе паўночна-ўсходняя частка.

Прычына высокай удзельнай вагі прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* на ўсходзе вобласці ў гістарычных асаблівасцях іх фарміравання і традыцыях, якія тут існуюць: 1) землі ўсходняй Віцебшчыны ў 1772 г. былі ўз'яднаны з Расіяй, а да прозвішчаў іх жыхароў былі далучаны рускія фарманты *-ов/-ев* і *-ин;* 2) праведзенае апытанне паказала, што жыхары некаторых усходніх раёнаў вобласці змяняюць і сёння прозвішчы шляхам далучэння да іх фармантаў *-оў/-еў/-аў*.

Прынята лічыць, што ў Беларусі змяншэнне частотнасці прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* адбываецца ў напрамку з усходу на захад. Адносна Віцебшчыны намі выяўлена, што паніжэнне прадуктыўнасці названых антрапонімаў адбываецца не строга з усходу на захад, а па дузе – з усходу на поўнач і паўночны захад, а потым на паўднёвы захад.

Высокая канцэнтрацыя прозвішчаў на *-скі/-цкі* (каля 20% і больш) на захадзе Віцебшчыны можа быць растлумачана, як нам здаецца, найперш гістарычнымі асаблівасцямі развіцця гэтага рэгіёна, які працяглы час адчуваў значны ўплыў польскіх традыцый (моўных, культурных, антрапанімных і інш.), бо знаходзіўся да 1795 г. у складзе Рэчы Паспалітай (гл. карту XII у першым томе "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак"). А ў польскай мове, паводле даных С. Роспанда, азначэнне асобы па мясцовасці, па ўладаннях пачало ўжывацца вельмі рана – ужо з XIII – XIV стст. Нашы назіранні паказваюць, што да сённяшняга дня на захадзе Віцебшчыны захавалася трывалая традыцыя называць людзей па месцы іх жыхарства або нараджэння, якая, відаць, бярэ пачатак з тых даўніх часоў.

Характар распаўсюджання прозвішчаў на *-овіч/-евіч/-авіч, -іч/-ыч/-ыц* абумоўлены таксама гістарычнымі асаблівасцямі: усходняя частка Віцебшчыны адчула ўплыў абмежаванняў, якія прымяняліся рускай вярхоўнай уладай у адносінах да іменаў па бацьку на *-овии/-евич*, таму працэнтны паказчык такіх адзінак на захадзе і ўсходзе вобласці істотна адрозніваецца.

Канцэнтрацыя прозвішчаў на *-енка/-энка/-анка* ва ўсходняй частцы Віцебшчыны блізкая да сярэдняга паказчыка прадуктыўнасці ва Украіне, дзе такія адзінкі займаюць вядучае месца.

Дастаткова высокая частотнасць антрапонімаў на *-ёнак/-онак* на захадзе і ў цэнтры Віцебскай вобласці (да 10% і больш) абумоўлена дыялектнымі асаблівасцямі акрэсленай тэрыторыі, дзе ў назвах маладых істот шырока выкарыстоўваецца суфікс *-ёнак/-онак*.

Такім чынам, асноўнымі фактарамі, якія аказваюць уплыў на прадуктыўнасць розных па структуры прозвішчаў у асобных рэгіёнах Віцебшчыны, з'яўляюцца: а) гістарычныя асаблівасці фарміравання тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны; б) геаграфічнае становішча вобласці, якая на ўсходзе і паўночным усходзе мяжуе з Расіяй, таму ў гэтых раёнах

узмацняецца ўплыў рускіх антрапанімных традыцый; паўночна-заходняя ж і заходняя часткі адчуваюць уздзеянне прыбалтыйскіх рэспублік; в) існуючыя на пэўных тэрыторыях моўныя, дыялектныя, антрапанімныя традыцыі.

Даследаванне геаграфіі прозвішчаў, матываваных апелятывамі, што з'яўляюцца характарыстыкай чалавека або ўказваюць на прафесію і род заняткаў, паказала наступнае: 1) апелятывы, якія абазначаюць колер, валодаюць розным прозвішчаўтваральным каэфіцыентам; самы высокі каэфіцыент у апелятыва *белы*, што абумоўлена яго станоўчым падтэкстам, а значыць шырокімі магчымасцямі ўжывацца ў якасці пажадальных імёнаў і мянушак; 2) антрапонімы, у аснове якіх "колеравыя" апелятывы, нераўнамерна распаўсюджаны на даследаванай тэрыторыі: прозвішчы з кампанентам *бел-* утвараюць масівы з высокай і нізкай частотнасцю, адзінкі з *чорн-, руд-, рыж-, сів-* размешчаны амаль раўнамерна; 3) не заўсёды тэрыторыя бытавання прозвішчаў, у аснове якіх апелятыў, што ўказвае на прафесію, супадае з арэалам, дзе гэты апелятыў зараз ужываецца; 4) антрапонімы Віцебшчыны, як правіла, утрымліваюць больш варыянтаў назвы прадстаўніка пэўнага роду заняткаў, чым ужываецца сёння жыхарамі вобласці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Дэрывацыя пры ўтварэнні прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны была больш характэрна, чым трансанімізацыя: другасных антрапонімаў налічваецца 71%, першасных – 29%.

Дэрываты прадстаўлены адзінаццаццю прозвішчнымі тыпамі, сярод якіх шэсць агульнаславянскіх, два ўсходнеславянскія, тры ўнутрымоўныя – два беларускія і адзін рускі. Вядучую ролю ў сістэме другасных прозвішчаў іграюць агульнаславянскія тыпы на *-оў/-еў/-аў, -ін/-ын* (35%), а таксама на *-скі/-цкі* (12%), на *-овіч/-евіч/-авіч, -іч/-ыч/-ыц* (9%). Удзельная вага прозвішчаў, што належаць усходнеславянскім, уласна беларускім і ўласна рускім тыпам, невялікая – адпаведна 8%, 5% і 0,1%.

Сярод першасных прозвішчаў пераважаюць адзінкі, якія ўтрымліваюць у сваім складзе апелятыўныя назоўнікі (80%). Ім значна ўступаюць па колькасці прозвішчы, у аснове якіх уласныя асабовыя імёны (16%) і апелятыўныя прыметнікі (5%).

Набор найбольш распаўсюджаных суфіксаў, якія фіксуюцца ў прозвішчаўтваральных асновах, амаль ідэнтычны ў першасных і ў другасных антрапонімах [1; 2].

2. Даследаванне семантыкі прозвішчаўтваральных асноў у тэрмінах семантычнага поля, апісанне ядзерна-перыферыйных адносін паказала, што ў якасці асноўнай зыходнай базы пры фарміраванні прозвішчаў

жыхароў Віцебшчыны выкарыстоўваліся нецаркоўныя імёны і мянушкі апелятыўнага паходжання (удзельная вага такіх адзінак у антрапаніміконе даследуемай тэрыторыі – 44%). Колькасць прозвішчаў, матываваных апелятывамі, якія ўжо падчас свайго ўзнікнення абазначалі асобу, і апелятывамі, што першапачаткова асобу не называлі і перш, чым стаць прозвішчам, прайшлі шлях "персаніфікацыя – анімізацыя – трансанімізацыя", амаль супадае (ім належыць адпаведна 55% і 45%), што з'яўляецца сведчаннем прыкладна аднолькавай ступені прозвішчаўтваральных магчымасцей названых апелятываў.

Сярод прозвішчаў, утвораных ад nomina personalia, вядучае месца займаюць антрапонімы, у аснове якіх адзінкі, што характарызуюць чалавека ў фізічным і псіхічным планах, а таксама ўказваюць на заняткі, прафесію, род дзейнасці, сацыяльны стан. Сярод nomina impersonalia найбольш колькаснымі з'яўляюцца апелятывы, што абазначаюць прадметы, а таксама адзінкі, якія належаць да фаўністычных назваў.

Уласныя асабовыя імёны выкарыстоўваліся пры ўтварэнні прозвішчаў радзей, чым імёны-мянушкі апелятыўнага паходжання: іх доля ў агульнай сістэме прозвішчаў складае 32%. Большасць адыменных прозвішчаў утрымлівае адаптаваныя формы хрэсных мужчынскіх імёнаў праваслаўнага і каталіцкага календара, у якіх адбыліся змены, звязаныя як з усходнеславянскімі, так і з беларускімі моўнымі традыцыямі.

Нязначная колькасць антрапонімаў матывавана неадаптаванымі хрэснымі і старажытнаславянскімі імёнамі, жаночымі імёнамі і андронімамі, імёнамі, якія знаходзяцца ва ўжытку прадстаўнікоў неславянскіх народаў – яўрэяў, літоўцаў, латышоў, арабаў, персаў і інш.

Адтапанімныя прозвішчы складаюць 14% у антрапаніміконе жыхароў Віцебшчыны. Большасць іх паходзіць ад назваў населеных пунктаў, размешчаных на даследуемай тэрыторыі (56%), што з'яўляецца сведчаннем адсутнасці шырокай міграцыі насельніцтва на тэрыторыі паўночнай Беларусі. Частка антрапонімаў утворана ад назваў вёсак, гарадоў, рэк і да т. п., размешчаных у іншых абласцях рэспублікі і блізкага замежжа – Польшчы, Расіі, Украіны. Айконімы ў асновах такіх прозвішчаў істотна пераважаюць над гідронімамі [2; 3; 4; 5; 6; 7; 8].

3. Характар асновы, а таксама тып фарманта пры ўтварэнні прозвішчаў абумоўлены лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі фактарамі, галоўнымі з якіх з'яўляюцца існуючыя на пэўных тэрыторыях антрапанімныя, дыялектныя, культурныя традыцыі; нацыянальна-рэлігійная прыналежнасць насельніцтва; блізкасць тэрыторый, агульнасць гістарычнага развіцця жыхароў паўночнай часткі Беларусі і народаў суседніх дзяржаў.

Адной з прычын таго, што на захадзе Віцебшчыны шматлікасцю вылучаюцца прозвішчы, асновы якіх утрымліваюць хрэсныя імёны

каталіцкага, а не праваслаўнага календара, з'яўляецца перавага на гэтай тэрыторыі насельніцтва, якое вызнае менавіта каталіцызм.

Той факт, што з усіх раёнаў Віцебскай вобласці, на тэрыторыі якіх бытуюць прозвішчы, матываваныя мужчынскімі і жаночымі яўрэйскімі іменамі, найбольшай канцэнтрацыяй адзінак вылучаюцца Лёзненскі, Верхнядзвінскі і Ушацкі, абумоўлены кампактным пражываннем яўрэяў на адзначаных тэрыторыях.

Сярод фактараў, якія вызначылі размяшчэнне арэала самай высокай прадуктыўнасці прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў, -ін/-ын* (ад 60% да 70%) менавіта на ўсходзе вобласці, вядучую ролю іграе наступны: землі ўсходняй Віцебшчыны ў 1772 г. былі аб'яднаны з Расіяй, пасля чаго іх насельніцтва спазнала ўплыў рускіх антрапанімных традыцый, паколькі да яго прозвішчаў былі далучаны рускія фарманты *-ов/-ев.* Тэндэнцыя афармлення прозвішчаў фінальнымі элементамі, якія здаўна лічацца адзнакай рускіх антрапанімных адзінак, захавалася на акрэсленых тэрыторыях і па сённяшні дзень, пра што сведчаць вынікі праведзенага аўтарам апытвання і назірання.

Нязначная колькасць антрапонімаў на *-овіч/-евіч/-авіч* на ўсходзе Віцебшчыны таксама абумоўлена канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі: у XVI – XVIII стст. вярхоўнай уладай Расіі было нададзена саслоўнае адценне названым адзінкам, таму існавала забарона на афармленне прозвішчаў пералічанымі фармантамі (акрэслены перыяд якраз ахоплівае час, калі землі ўсходняй Беларусі, а значыць і сучаснай усходняй Віцебшчыны ўваходзілі ў склад Расіі).

Фактарамі, якія прадвызначылі высокую прадуктыўнасць антапанімных прозвішчаў на *-скі/-цкі* на захадзе вобласці, з'яўляюцца а) працяглае знаходжанне акрэсленай тэрыторыі ў складзе Рэчы Паспалітай, і як вынік – фарміраванне традыцый называння чалавека па месцы яго жыхарства або нараджэння ў заходняй частцы Віцебшчыны пад уплывам польскіх антрапанімных традыцый, б) існаванне гэтых прынцыпаў іменавання асобы па сённяшні дзень [1; 9; 10].

4. Прозвішчы нераўнамерна размешчаны на даследуемай тэрыторыі, прычым гэта мае адносіны да антрапонімаў, розных як па структуры, так і па семантыцы прозвішчаўтваральных асноў. Практычна ў кожным прозвішчным тыпе назіраюцца масівы (іх колькасць вар'іруецца ад аднаго да трох) самай высокай прадуктыўнасці аднаструктурных антрапонімаў. Такія зоны могуць займаць плошчу ад аднаго раёна да 1/3 часткі вобласці. Па меры аддалення ад гэтых масіваў канцэнтрацыя адзінак паступова памяншаецца, а на асобных тэрыторыях яна нават блізкая да нулявой.

Аналіз распаўсюджання антрапонімаў, матываваных рознымі ў семантычным плане апелятывамі, выявіў, што самымі частотнымі сярод "колеравых" з'яўляюцца прозвішчы з кампанентам *бел-*, прычым

размяшчэнне іх на даследуемай тэрыторыі таксама характарызуецца наяўнасцю зон высокай і нізкай прадуктыўнасці. Прозвішчы, утвораныя ад апелятываў, якія абазначаюць іншы колер, амаль раўнамерна распаўсюджаны на Віцебшчыне.

Даследаванне прозвішчаў, у аснове якіх апелятывы, што абазначаюць прафесію і род заняткаў, паказала, што, па-першае, антрапонімы, у складзе якіх пэўныя варыянты адной назвы, бытуюць на розных тэрыторыях, межы якіх могуць не супадаць з зонамі , дзе сёння гэтыя варыянты ўжываюцца; па-другое, пры ўтварэнні прозвішчаў выкарыстана значна больш варыянтаў канкрэтнай назвы, чым на сучасным этапе ўжываецца ў мове мясцовых жыхароў [1; 9].

5. У выніку супастаўлення нашых даных з матэрыялам іншых даследчыкаў выяўлена, што сучасныя прозвішчы жыхароў вывучаемай часткі Беларускага Паазер'я характарызуюцца адметнасцю семантыкі прозвішчаўтваральных асноў, структуры і геаграфіі, нягледзячы на тое, што асобныя паказчыкі прадуктыўнасці і размяшчэння блізкія да агульнабеларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх і іншых паказчыкаў.

Так, напрыклад, удзельная вага першасных прозвішчаў на Віцебшчыне складае 29%, а ў некаторых раёнах яна амаль дасягае саракапрацэнтнага паказчыка, што значна перавышае сярэдні каэфіцыент па Беларусі – 25%.

Прозвішчныя тыпы на даследуемай тэрыторыі адметныя ў колькасным і якасным планах ад тыпаў, якія распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі і суседніх рэспублік. Гэта выражаецца ў наступным: а) частотнасць антрапонімаў (і ў цэлым па вобласці, і ў межах асобных раёнаў) кожнага прозвішчнага тыпу адрозніваецца ад паказчыкаў па Беларусі і ў суседніх народаў; б) тут зафіксаваны тып на *-іх/-ых*, які нідзе больш па рэспубліцы не адзначаны; в) на вывучаемай тэрыторыі бытуюць прозвішчы двух унутрымоўных тыпаў (на *-ёнак/-онак* і на *-еня/-эня*), якія характэрны толькі для антрапанімікону беларусаў [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7; 10].

Такім чынам, прозвішчы жыхароў Віцебшчыны займаюць сваё, спецыфічнае месца як у агульнабеларускім, так і ў агульнаславянскім антрапаніміконе. Рэгіянальная антрапанімія ўтрымлівае, акрамя лінгвістычных, неабходныя для разумення гістарычных працэсаў мінулага звесткі пра светапогляд, культуру, быт, звычкі, характар людзей, якія засялялі даследуемую тэрыторыю.

## СПІС ПРАЦ, АПУБЛІКАВАНЫХ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў часопісах

1. Семянькова Г. К. Прозвішчныя тыпы Віцебшчыны: паміж усходам і захадам // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, 1999. -- № 4 (14). – С. 48--53.

2. Семянькова Г. К. Адыменныя прозвішчы ў антрапанімнай сістэме Віцебшчыны // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, 2001. -- № 1 (19). – С. 47--52.

3. Семянькова Г. К. Аб'ём і змест аднаго з мікраядзер семантычнага поля "Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны" // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта, 2001. -- № 2. – С. 56–63.

4. Семянькова Г. К. Матранімічныя прозвішчы на тэрыторыі Віцебшчыны: сістэмны і арэальны аспект // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, 2001. -- № 3 (21). – С. 69--71.

### Матэрыялы і тэзісы канферэнцый

5. Семянькова Г. К. Адтапанімныя прозвішчы ў антрапанімнай сістэме Віцебшчыны: V Республиканская научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов Республики Беларусь: Материалы конференции. – В 5 ч. Ч. 3. – Гродно: ГрГУ, 2000. – С. 8 – 11.

6. Семянькова Г. К. Адыменныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: праблемы матывацыі // Наука и творчество молодёжи – XXI веку. Итоги НИР – 2000. Тезисы докладов V (50) научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов. – Витебск: Изд-во ВГУ им. П. М. Машерова, 2000. – С. 34.

7. Семянькова Г. Балтыйскія і яўрэйскія элементы ў прозвішчах жыхароў Віцебшчыны // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае моваазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: Мат-лы V міжнар. навук. канф. / Пад агульн. рэд. Л. М. Вардамацкага, А. М. Мезенкі. – Віцебск: Выд-ва ВДУ імя П. М. Машэрава, 2000. – С. 109--110.

8. Семянькова Г. К. Мікраядро "Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, утвораныя ад nomina impersonalia": VI Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларусі: Матэрыялы канферэнцыі. – Віцебск: Выд-ва ВДУ імя П. М. Машэрава, 2001. – С. 26—28.

9. Семянькова Г. К. Анамастычная геаграфія як люстэрка гістарычных працэсаў // Русистика и белорусистика на рубеже веков. Вклад белорусских лингвистов, уроженцев Могилёвщины, в науку: Тезисы докладов международных чтений международной научной

конференции “Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья”, 25-26 октября 2001 г. / Под ред. Т. Г. Михальчук. – Могилёв: МГУ им. А. А. Кулешёва, 2001. – С. 38--40.

Навучальны дапаможнік

10. Семянькова Г. К. Сучасны імяннік Віцебшчыны: Метадычны дапаможнік па антрапаніміі. -- Віцебск: Выд-ва ВДУ імя П. М. Машэрава, 2001. – 32 с.

## РЭЗЮМЭ

## СЕМЯНЬКОВА ГАЛІНА КАНСТАНЦІНАЎНА

## ПРОЗВІШЧЫ ЖЫХАРОЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СТРУКТУРА, СЕМАНТЫКА, ГЕАГРАФІЯ

Ключавыя словы: адапелятыўнае прозвішча, адтапанімнае прозвішча, адыменнае прозвішча, анімізацыя, антрапонім, дэрывацыя, каляядзерная зона семантычнага поля, картаграфаванне, лінгвагеаграфія, макраарэал, мікраарэал, онім, перыферыя семантычнага поля, прозвішчаўтваральная аснова, прозвішчаўтваральны фармант, прозвішчны тып, семантычнае поле, тапонім, трансанімізацыя, ядро семантычнага поля.

Аб'ектам даследавання ў дысертацыі з'яўляюцца сучасныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны. Прадмет разгляду -- семантыка, структура і геаграфія прозвішчаў жыхароў даследуемай тэрыторыі.

Мэта даследавання -- комплексны аналіз сучасных прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ў структурным, семантычным і лінгвагеаграфічным аспектах.

Пры аналізе прозвішчаў былі выкарыстаны наступныя метады: апісальны, параўнальна-супастаўляльны, параўнальна-гістарычны, колькасны, арэальны, элементы статыстычнага аналізу.

Вынікі даследавання сведчаць, што прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, з'яўляючыся неад'емнай часткай як агульнабеларускага, так і агульнаславянскага антрапанімікону і захоўваючы ўласцівыя гэтым сістэмам традыцыі, валодаюць адметнымі ў семантычным, структурным і геаграфічным планах рысамі, што дазваляе гаварыць пра спецыфічнасць антрапанімнай сістэмы паўночнай Беларусі.

Дысертацыя акажа рэальную дапамогу работнікам ЗАГСаў і пашпартных сталоў пры вырашэнні пытаняў, звязаных з захаваннем аднастайнасці ў напісанні прозвішчаў, з перадачай іх сродкамі іншай мовы. Матэрыял і вынікі даследавання могуць быць прыменены ў практыцы школьнага і універсітэцкага выкладання -- на лекцыях і практычных занятках па сучаснай беларускай мове (пры вывучэнні лексікі, словаўтварэння і інш.), стылістыцы, лінгвістычным аналізе тэксту, на спецкурсах і спецсемінарах, пры падрыхтоўцы і напісанні курсавых і дыпломных работ; на уроках, факультатывах, занятках гуртkоў па беларускай мове, гісторыі, пры ажыццяўленні краязнаўчай працы, правядзенні конкурсаў, алімпіяд і інш.

# РЕЗЮМЕ

СЕМЕНЬКОВА ГАЛИНА КОНСТАНТИНОВНА

## ФАМИЛИИ ЖИТЕЛЕЙ ВИТЕБЩИНЫ: СТРУКТУРА, СЕМАНТИКА, ГЕОГРАФИЯ

Ключевые слова: отапеллятивная фамилия, оттопонимная фамилия, отыменная фамилия, онимизация, антропоним, деривация, околоядерная зона семантического поля, картографирование, лингвогеография, макроареал, микроареал, оним, периферия семантического поля, фамилиеобразующая основа, фамилиеобразующий формант, фамильный тип, семантическое поле, топоним, трансонимизация, ядро семантического поля.

Объектом исследования в диссертации являются современные фамилии жителей Витебщины. Предмет рассмотрения – семантика, структура и география фамилий жителей исследуемой территории.

Цель исследования – комплексный анализ современных фамилий жителей Витебщины в структурном, семантическом и лингвогеографическом аспектах.

При анализе фамилий были использованы следующие методы: описательный, сравнительно-сопоставительный, сравнительно-исторический, количественный, ареальный, элементы статистического анализа.

Результаты исследования свидетельствуют, что фамилии жителей Витебщины, являясь неотъемлемой частью как общебелорусского, так и общеславянского антропонимикона и сохраняя свойственные этим системам традиции, обладают отличительными в семантическом, структурном и географическом плане чертами, что позволяет говорить о специфичности антропонимной системы северной Беларуси.

Диссертация окажет реальную помощь работникам ЗАГСов и паспортных столов при решении вопросов, связанных с сохранением единообразия в написании фамилий, с передачей их средствами другого языка. Материал и результаты исследования могут быть применены в практике школьного и университетского преподавания – на лекциях и практических занятиях по современному белорусскому языку (при изучении лексики, словообразования и др.), стилистике, лингвистическом анализе текста, на спецкурсах и спецсеминарах, при подготовке и написании курсовых и дипломных работ; на уроках, факультативах, занятиях кружков по белорусскому языку, истории, при осуществлении краеведческой работы, проведении конкурсов, олимпиад и др.

## SUMMARY

**SEMEN'KOVA GALINA KONSTANTINOVNA**

# SURNAMES OF THE VITEBSHCHINA (THE VITEBSK REGION) RESIDENTS: STRUCTURE, MEANING, GEOGRAPHY

Key words: surname derived from an appellative, surname derived from a toponym, onymization, anthroponym, derivation, near-nuclear zone of a semantic field, map-making, linguistic geography, macroarea, microarea, onym, semantic field periphery, surname-forming stem, surname-forming affix, surname type, semantic field, toponym, transonymization, semantic field nucleus.

The object of the research is the modern surnames of the Vitebshchina inhabitants.

The subject of the research is the meaning, structure and geography of the Vitebshchina residents'surnames.

The aim of the research is the complex analysis of the modern surnames of the Vitebshchina inhabitants covering structural, semantic and linguistic-geographical aspects.

To analyze the surnames the following methods have been used: the descriptive method, the comparative-correlative method, the comparative-historical method, the quantitative analysis, the areal method, the elements of the statistical analysis.

The results of the research show that the Vitebshchina inhabitants' surnames being an integral part of the all-Belarusian and all-Slavonic anthroponymicon preserve the traditions inherent in these systems. At the same time the surnames have semantic, structural and geographical distinguishing features. It implies the peculiarity of the anthroponimic system of Northern Belarus.

The dissertation will be of an actual help to the registry offices (civil registration) and passport offices staff to preserve the uniformity in the spelling of the surnames as well as to transfer them by the means of other language. The material and the results of the research can be applied to school and high school teaching modern Belarusian language (while studying lexicon, word-formation, etc.), stylistics, the linguistic analysis of the text, special courses and seminars. They can be used for delivering lectures on the above mentioned academic disciplines and conducting practical studies; for working out and carrying out course and graduation research papers; for arranging class and group work, contests, optional courses, etc. in the Belarusian language, History, Ethnography.